Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2014-01-31

# Пункціpам

✔ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў навуковую грамадскасць з Днём беларускай навукі і 85-годдзем Нацыянальнай акадэміі навук краіны. «Навука стварае надзейны інтэлектуальны фундамент беларускай дзяржавы, вызначае шляхі нашага руху наперад. Імёны і дасягненні выдатных вучоных з'яўляюцца прадметам гонару ўсяго народа», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Нацыянальная акадэмія навук за гады сваёй гісторыіператварылася ў буйнейшы даследчы цэнтр краіны, які вырашае не толькі фундаментальныя, але і прыкладныя праблемы, карыстаецца аўтарытэтам у свеце», — гаворыцца ў віншаванні.

✔ Кіраўнік дзяржавы падпісаў распараджэнне «Аб назначэнні стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным на 2014 год». Штомесячныя стыпендыі ў памеры 3 млн. рублёў атрымаюць 90 маладых навукоўцаў, у тым ліку 10 дактароў навук ва ўзросце да 45 гадоў, 47 кандыдатаў навук да 35 гадоў, 33 вучоныя без ступені да 30 гадоў. У групу стыпендыятаў уключаны перспектыўныя даследчыкі, якія атрымалі вынікі, што маюць істотнае навуковае і практычнае значэнне.

✔ Беларускія і расійскія даследчыкі завяршаюць працу па стварэнні фундаментальнай манаграфіі «Вызваленне Беларусі. Перамога. Трагедыя. Памяць» да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Манаграфія распавядзе пра падзеі на тэрыторыі рэспублікі падчас Другой сусветнай вайны, пра дапамогу вайскоўцам з боку партызан і мірных грамадзян. Выданне аналізуе крыніцы, якія раней не выкарыстоўваліся, а таксама прапануе чытачам унікальныя фотаздымкі.

✔ Паводле дырэктара дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Вадзіма Кармазіна, ужо ў лютым для зручнасці гасцей чэмпіянату свету па хакеі будуць скарэкціраваны графікі работы музеяў ды іншых асноўных турыстычных аб'ектаў Мінска. Карэкціроўка ў кожным выпадку адбудзецца індывідуальна.

✔ Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў падчас сустрэчы з ваяводам Падляскім Мацеем Жыўна (Польшча) паведаміў, што ўжо сёлета, на пачатку верасня, плануецца завяршыць работы па рэстаўрацыі маёнтка Агінскіх у вёсцы Залессе Смаргонскага раёна. Рэстаўрацыя пачалася ў 2011 годзе. Работы фінансуюцца са сродкаў дзяржаўных праграм з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў, а таксама са сродкаў ЕС — у адпаведнасці з праектам трансгранічнага супрацоўніцтва.

✔ Пачаўся прыём заявак на ўдзел у конкурсах XXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». У адборы могуць удзельнічаць выканаўцы, якія маюць досвед выступленняў на розных канцэртных мерапрыемствах, а таксама паспяхова праявілі сябе на рэспубліканскіх і міжнародных музычных конкурсах. Узроставыя рамкі для XXIII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2014» — 18 — 31 год, для XII Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2014» — 7 — 12 гадоў. Заяўкі на ўдзел у адборачных турах прымаюцца да 15 сакавіка ўключна.

**Падрыхтавала Іна ЛАЗАРАВА**

"Літаратура і мастацтва". Пункціpам